Известия Гомельского государственного университета
имени Ф. Скорины, № 1(82), 2014

*УДК 821.161.3-3*Гарэцкі*

# Праблема лёсу беларускай нацыі ў творах Максіма Гарэцкага

А.М. Мельнікава

У артыкуле аналізуюцца падыходы класіка беларускай літаратуры Максіма Гарэцкага да выяўлення лёсу нацыі. Адзначаецца, што ў сваіх творах пісьменнік падае цэласную мадэль нацыянальнага быцця ў адзінстве духоўнага і матэрыяльнага. М. Гарэцкі сцвярджае першарадную важнасць нацыянальна-духоўнага кампанента быцця. Пісьменнік паказвае драматызм і трагізм гісторыі народа праз лёс асобнага чалавека, сям'і. М. Гарэцкі імкнецца зразумець унутраныя заканамернасці нацыянальнага быцця. Нацыянальнае асэнсоўваецца пісьменнікам у непарыўнай сувязі з сацыяльным.

**Ключавыя словы**: лёс нацыі, гісторыя, трагізм, драматызм, сацыяльнае, хроніка, быццё, філасофская канцэпцыя, духоўнасць.

The article analyses the approaches of the classic of Belarusian literature Maxim Garetski to the image of the fate of the nation. It is noted that the writer takes a holistic model of the national existence in the unity of the spiritual and material in his works. M. Garetsky seeks to understand the internal laws of the national existence. The national conceived by the writer is in close connection with the social. M. Garetsky approves the paramount importance of national-spiritual components of existence. The writer shows the drama and tragedy of the history and the tragedy of national life through the fate of the individual, family.

**Keywords**: the fate of the nation, history, tragedy, drama, social, chronicle, genesis, philosophical concept, spirituality

М. Гарэцкі – класік беларускай літаратуры, творчасць якога мела значны ўплыў на далейшае развіццё нацыянальнага прыгожага пісьменства. У сваіх творах М. Гарэцкі падае цэласную мадэль нацыянальнага быцця ў адзінстве духоўнага і матэрыяльнага пачаткаў.

Праблема лёсу нацыі – у цэнтры аповесцей М. Гарэцкага «Ціхая плынь», «Дзве душы», «Камароўская хроніка», п'ес «Жартаўлівы Пісарэвіч», «Чырвоныя ружы», дакументальна-мастацкіх запісак «На імперыялістычнай вайне», апавяданняў кніг «Досвіткі», «Сібірскія абразкі».

Імкненне спасцігнуць сутнасць, унутраныя заканамернасці нацыянальнага жыцця абумовіла зварот пісьменніка да гісторыі. Так з'явілася аповесць «Камароўская хроніка», якую М. Мушынскі назваў «галоўнай кнігай М. Гарэцкага» [1, с. 408]. Глыбока твор прааналізаваны А. Адамовічам [2]. Даследчык адзначае, што пісьменнік доўга шукаў адпаведную форму падачы матэрыялу, пакуль не прыйшоў да «разумення той эстэтычнай ісціны, што дакументальнасць у стылі, манеры, у жанры – гэта не толькі прамежкавая ступень да больш закончанай формы (хоць так і бывае), а раўнапраўная і таксама закончаная форма» [3, с. 311].

У «Камароўскай хроніцы» М. Гарэцкі малюе маштабную карціну быцця і побыту беларусаў, глыбока даследуе нацыянальны характар. Жыццё нацыі ўзнаўляецца на значным гістарычным адрэзку часу: адмена прыгону, руска-японская вайна, Першая сусветная война, рэвалюцыі, савецка-польская вайна, 30-х гады XX стагоддзя.

У якасці вызначальных пісьменнік вылучае наступныя перыяды нацыянальнай гісторыі: 1863–1905 гг., 1905–1917 гг., 1917–1921 гг., 1922–1923 гг., 1924–1937 гг.

У першым раздзеле М. Гарэцкі звяртаецца да падзей 1772 г. Аповесць пачынаецца ўзгадкамі пра «далучэнне краю да Расіі (1772)» [4, с. 7], што невыпадкова. На думку В. Уткевіч, «пазагістарычнасць і страта незалежнасці няяўна, але атаясамліваюцца пісьменнікам» [5, с. 164].

У накідах да твора М. Гарэцкі вылучае вайну 1812 г., 1831 г., які ў пісьменніка пазначаны як "польскае паўстанне", скасаванне уніі ў 1839 г. [3, с. 314]. Паказальна, што дзеянне твора абрываецца 1937 г., надзвычай трагічным як для Беларусі, так і для самога пісьменніка. Ніякіх запісаў за гэты год М. Гарэцкі не паспеў пакінуць.

Айчынныя даследчыкі (А. Адамовіч, С. Дубавец) адзначалі ўніверсальнасць «Камароўскай хронікі» – кніга пачынаецца як Стары Запавет: «Задумаўскі род у Камароўцы пайшоў ад двух братоў <...> Імя першага брата забыта. У яго сыноў не было, а толькі дочкі: Зося і Ганна. Ганну аддалі замуж у Палянку, за шапавала Міколу Брынду» [4, с. 8].

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Пісьменніка вылучала імкненне максімальна глыбока пранікнуць у сутнасць важных гістарычных рэалій з мэтай адэкватнага пазнання мінулага і сучаснасці. Таму М. Гарэцкі скрупулёзна, як сярэднявечны летапісец, фіксуе разнастайныя факты, эпахальныя і нібыта малазначныя, у іх часавай паслядоўнасці. А. Адамовіч пісаў на гэты конт: «Чалавек амаль усё жыццё збіраў матэрыял для вялізнага твора (у галаве, на паперы, у той прадаўгаватай скрыні для пісьмаў). Для твора, які ўсё ахопіць, усё выкажа» [3, с. 312]. На думку А. Адамовіча, твор атрымаўся, бо «гэта асабліва важкі быў матэрыял, набрынялы сокамі самога жыцця» [3, с. 312].

Змест хронікі суадносіцца з важнымі гістарычнымі і духоўнымі працэсамі нацыянальнага быцця ўвогуле, дазваляе адлюстраваць яго ва ўсёй шматграннасці, разнастайнасці, паўнаце. Асновай сюжэта выступае тут гістарычны рух часу. Спецыфіка жанру хронікі прадугледжвае выяўленне ўзаемазалежнасці гістарычных падзей і лёсу як асобнага чалавека, сям'і, так і нацыі ў цэлым.

Светапоглядныя аспекты беларускай мадэлі свету асэнсоўваюцца М. Гарэцкім на розных узроўнях: і мікракосм асобы і мікракосм нацыі. Пісьменніку ўласціва шырыня погляду на свет, яго ўспрыманне як пэўнай цэласнасці, у адзінстве агульнага і асабістага.

Падрабязнае апісанне знешне-побытовага дазваляе зафіксаваць іманентна ўласцівае беларусам, спрыяе больш адэкватнаму спасціжэнню філасофіі нацыянальнага быцця. Акцэнт у пісьменніка зроблены на сцвярджэнні першаступеннай важнасці нацыянальна-духоўнай кампаненты быцця. М. Гарэцкі асэнсоўвае лёс чалавека ў адзінстве з гістарычным лёсам народа, як духоўную пераемнасць пакаленняў. На філасофскі патэнцыял твора звярталі ўвагу А. Адамовіч, М. Мушынскі, Ул. Конан.

Так, А. Адамовіч у кнізе «Браму скарбаў сваіх адчыняю…» акцэнтуе ўвагу на тым, што М. Гарэцкі ўздымаецца ад прыватнага да «філасофскага асэнсавання гістарычнага лёсу свайго народа» [2, с. 24].

М. Мушынскі падкрэслівае: «М. Гарэцкі здолеў дакументальна-мастацкімі сродкамі намаляваць у ім яскравы эпічны вобраз эпохі, выявіць праз лёсы герояў змястоўную філасофскую канцэпцыю жыцця» [1, с. 417].

Ул. Конан назваў «Камароўскую хроніку» «творам небывалым у нацыянальнай і сусветнай літаратуры», «літаратурай новага кшталту, у якой знікаюць межы паміж быццём і мастацтвам, літаратурай і гісторыяй, мастацкай медытацыяй і рэальнай экзістэнцыяй» [6, с. 105].

Такім чынам, у «Камароўскай хроніцы» пісьменнік выявіў нацыянальна-духоўную і матэрыяльную спецыфіку нацыянальнага быцця, нацыянальны хранатоп. Гэта сведчыць пра тое, што літаратура ў Беларусі выконвала ахоўную функцыю, зберагала традыцыйныя каштоўнасці. М. Гарэцкі здолеў увасобіць праз мастацкае слова беларускую самасць. Зварот да жанру хронікі дазваляе сцвердзіць жыццёвасць, трываласць духоўных асноў жыцця. Быццё чалавека не абмяжоўваецца нараджэннем і смерцю, яно ўключана ў мінулае, сучаснае і будучае народа, што суадносіцца з высновамі М. Хайдэгера пра радзіму як анталагічную аснову быцця асобнага чалавека.

Са старонак твора пісьменніка паўстае гісторыя моцнага сялянскага роду Задумаў (Батураў), якія жывуць у адпаведнасці са строгай сістэмай маральных правіл. Прадстаўнікі роду выступаюць носьбітамі пэўных базавых архетыпаў (мадэляў чалавечых лёсаў), пэўных архетыповых уяўленняў пра чалавека. Дзед Кузьма Батура – як патрыярх сямейнага роду, Вялікі Старац: «Успаміналі нябожчыка цёплым словам, хвалілі. Вылічалі гады. Сто гадоў ці болей пражыў. Добры чалавек быў, ціхі, спакойны. <…> Удаўцом быў гадоў 45. За прыгонам гора нацярпеўся..» [4, с. 43]. Бацька ўвасабляе аўтарытарнасць, закон. Ганна – архетып Маці, увасабленне дабрыні, пяшчоты, спагадлівасці, захавальніцы дамашняга ачага. Сыны ўвасабляюць логіку, інтэлект, волю да дзеяння, стваральнай працы. Марынка з'яўляецца носьбітам чысціні, непасрэднасці, самаахвярнасці. Паказальна, што яе лёс складваецца трагічна: яна заўчасна памірае ў выніку няшчаснага выпадку. Лёс Марынкі тыповы сваёй характэрнай трагічнасцю для Беларусі. Аналагічным чынам складваецца лёс іншых гераінь беларускіх пісьменнікаў, «нявестаў» Беларусі.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ ФРАНЦИСКА СКОРИНЫ

М. Гарэцкі ўзнаўляе натуральную плынь жыцця: нараджэнне, саленне, вяселле, выхаванне дзяцей, смерць. Выяўляе сэнсавую змястоўнасць гэтага жыцця. Так, найважнейшым крытэрыем ацэнкі чалавека выступае ў пісьменніка стаўленне да іншага чалавека, да зямлі, працы. Працэс самавыяўлення героя заключаецца не ў гвалце і разбурэнні, а ў дабрачыннасці, маральнасці, духоўнасці, творчай гаспадарчай ініцыятыве, стваральнай дзейнасці на карысць радзімы.

Героі М. Гарэцкага – шчырыя вернікі. Яны трымаюцца царкоўных канонаў, посцяцца, ходзяць у царкву. Героі дбаюць не толькі пра сваю душу, але і пра душы сваіх блізкіх пасля адыходу ў іншы свет. Янка Ваявода завяшчае грошы царкве, «каб паміналі тры разы ў год – яго, бацьку і матку» [4, с. 30].

М. Гарэцкі пастаянна падкрэслівае ў сваіх героях іх чалавечнасць. Пра жаніха Вусцінкі Цераха піша: «…прыгожы, усё смяецца і з усімі дужа ласкавы, далікатны» [4, с. 44]. Пра Вусцінку: «Ах, якая дзяўчына была! Ні з кім яна ніколі не пасварылася, нікому няласкавага слова не сказала, а як з дзядзінаю сваёю Ганнаю дружыла. Дзве яны ў сям'і былі – залатога характару і залатыя рукі» [4, с. 44]. Пра Адарку Бондарыху аўтар заўважае: «Ласкавае слова скажа, шпарка пойдзе <…> З свякроўю дужа згодна жыла. І свёкар дужа любіў і паважаў яе. Працавітая была» [4, с. 52].

Героі М. Гарэцкага здольныя на глыбокія пачуцці, на прыгожае іх праяўленне: «Марка, бывала, на руках яе насіў, як дзіця насіў…» [4, с. 53].

М. Гарэцкі вылучае ў сваіх героях моц сямейных сувязей, добразычлівасць, спагаду, спачуванне адно да аднаго. Так, «на хрэсьбіны звалі ўсю Камароўку. І была ўся радня з Харошага, з Палянкі. Былі з Глінні <…> Драчон наняслі поўну саламянку. Нанеслі мяса, яец, кашы, блінцоў, – усяго, што бывала на хрэсьбіны насілі» [4, с. 27–28].

Героі балюча перажываюць страту блізкіх. Тамаш Ваявода моцна сумуе па смерці брата: «А ён плакаў і там, і ў двары. Жаласлівы дужа быў к брату» [4, с. 32]. Палута не можа супакоіцца пасля смерці бацькі Кузьмы, хаця і пражыў ён больш за сто гадоў: «Як мне цяпер жыць, Лявонічка? Няма ўжо ў мяне татухны» [4, с. 43]. Пакутліва кожны з сямейнікаў Батураў перажывае заўчасную і трагічную смерць Марынкі, кожны як мага стараецца падтрымаць маці. Цяжка перажывае смерць жонкі Марка: «Яна мне першы друг была. Я на другую жанчыну і не зірну. Друг мой памёр!» – скажа і як заплача!» [4, с. 53]. Герой імкнецца праявіць клопат пра жонку нават пасля яе смерці: сам робіць труну, выбірае лепшыя дошкі.

Паказальнае стаўленне герояў да смерці: спакойнае, стрыманае, з усведамленнем важнасці і адначасова непазбежнасці гэтай падзеі. Смерць успрымаецца натуральнай падзеяй у агульнай плыні жыцця. Героі імкнуцца ў апошні адведзены ім час зрабіць як мага больш карысных спраў, развітацца з роднымі, належным чынам падрыхтавацца да гэтай падзеі: «З усімі прасцілася, хлеба адрэзала, усіх благаславіла. І памёрла. Яе і бацька, Мацвей Мароз, так паміраў. Памыўся сам, надзеў тую адзежу, што на смерць, лёг на лаўку і памёр» [4, с. 35]. Танальнасць твора мяняецца, калі М. Гарэцкі апісвае смерць гвалтоўную, ненатуральную, калі нейкая чужая і варожая сіла ўрываецца ў звыклую плынь жыцця Камароўкі – Першая сусветная вайна і тыя падзеі, што адбыліся пасля.

Не абмінае М. Гарэцкі побытавыя адметнасці беларускага жыцця: «На славу вяселле было. Пяклі яны 10 булак хлеба, каля паўпуда кожная <…>. Былі кілбасы, мяса, тварог са смятанаю, сцюдзень, парасяціна, пірагі (булкі), пасыпаныя цукрам. Каша з маслам. Бліны» [4, с. 44–45], «там, у маладога, таксама добра пагулялі. Калюжанскія свашкі хацелі там перацягнуць камароўскіх. І тыя і тыя выбіралі песні найцікавейшыя, рэдкія. <…> А ўсяго за вяселле спялі песень сот пяць, на сто розных мелодый» [4, с. 45]. Гэтае «песень сот пяць, на сто розных мелодый» сведчыць пра багаты ўнутраны свет, культуру беларускага сялянства. Вядома, што М. Гарэцкі разам з кампазітарамі М. Аладавым і А. Ягоравым запісаў ад сваёй маці каля ста пяцідзесяці песень («Народныя песні з мелодыямі»).

Дакалгаснае жыццё ў апісаннях М. Гарэцкага паўстае досыць заможным і забяспечаным: «Гаспадарскія справы ў двары былі ў добрым стане. Хлеба было даволі. Елі добра. Было сала, мяса, блінцы часам, пірагі. І нават цукру трохі мелі. А малака дос-даволюхны» [4, с. 234].

М. Гарэцкі ўзнаўляе жыццё сялян аб'ектыўна, не абмінаючы і тыя негатыўныя моманты, якія часам здараліся: сваркі і крыўды, непаразуменні: «У двары, асабліва ўранні,

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ ФРАНЦИСКА СКОРИНЫ

крык бацькі, маткі. І зрабілася тым часам Лаўрыку ў Камароўцы нудна. Мужчыны ўвесь час рэжуцца ў карты. Бабы дурэюць, пляткарань, зводзяць языком, махаюць языком. І здавалася яму, што нідзе няма нічога жывога, светлага, адхланнага…» [4, с. 96].

Маладыя героі М. Гарэцкага прагнуць высокага, лепшага, імкнуцца да маральнага ўдасканалення, балюча перажываюць «драбязлівасць жыцця»: «Матэрыяльныя рахункі, татавы крыкі. Перад вачмі ўся драбязлівасць жыцця. Сэрца сціскаецца ад жалю, што людзі такія дробныя» [4, с. 160].

У прозе пісьменніка на шырокім сацыяльна-бытавым фоне адлюстравана не толькі гісторыя жыцця, але і рост свядомасці чалавека. М. Гарэцкі паказвае працэс нацыянальнага самаўсведамлення, станаўлення нацыянальнай інтэлігенцыі. Міхалка Тамашавіч Ваявода, настаўнік, што «першы з сялян ува ўсёй акрузе, можа, у цэлым павеце, такую адукацыю атрымаў», цікавіўся «родным краем сваім» [4, с. 30]. Пасля яго смерці сярод кніг знайшлі кнігу «Белоруссия и Литва» пад рэдакцыяй Бацюшкава. Паказальна, што гэтага героя таксама напаткаў трагічны лёс: ён захварэў на «скарацечныя сухоты».

Прагнуць быць карыснымі свайму народу прадстаўнікі рода Батураў: Кузьма, Лаўрык, Марынка. У гэтым яны бачаць сэнс сваёй дзейнасці, на гэта скіраваны ўсе іх намаганні. Лаўрык абраў прыродазнаўчы накірунак, марыць, каб Беларусь стала «сапраўднай Даніяй (ён меў на ўвазе эканоміку)» [4, с. 198].

М. Гарэцкі апісвае працэс пашырэння беларусізацыі, энтузіязм маладых беларусаў адбудаваць сваю краіну, абудзіць патрыятычныя пачуцці, выхаваць усведамленне нацыянальнай годнасці: «Вучні браліся за ўсё: за ўкладанне беларускай тэрміналогіі, за апрацоўку кніжачак па сельскай гаспадарцы для сялян на беларускай мове, за выданне свайго часопісу. Гэты імпэт падаграваўся ў іх тым, што скрозь бачылі яны варожасць і пагарду да беларускае мовы» [4, с. 132].

У дзённікавых запісах герояў, лістах, дзе зафіксаваны самыя розныя жыццёвыя падзеі, перажыванні ўнутранага плана, прасочваецца цэласнасць асобы, жаданняў, акрэсленае імкненне быць актыўным суб'ектам працэсу нацыянальнага адраджэння.

Пісьменнік пастаянна фіксуе набыткі і страты на шляху нацыянальнага самаўсведамлення, адзначае стаўленне той ці іншай асобы да беларускай справы: «Людзі тут толькі яшчэ пачыналі лічыць сябе беларусамі, пялі "Адвеку мы спалі…"» [4, с. 198].

М. Гарэцкі адзначае праслед герояў за беларускую справу рознымі ўладамі: «"Dsiennik Wilenski" напісаў: на якой падставе сядзіць у Вільні гэты вораг польскасці і агент маскоўскага бальшавізму Задума?» [4, с. 232].

У творах М. Гарэцкага адлюстраваны і працэс каланізацыі краю: «І тады клопату набраліся, калі хто хацеў жаніцца, а не ўмеў маліцца па-руску. Поп не вянчаў або дужа вялікія грошы браў» [4, с. 9], «потым разбагацеў, асабліва калі перайшоў з каталіцтва на праваслаўную веру і калі яму пачалі даваць вялікія казённыя падрады» [4, с. 13].

Апісанне спецыфікі часу і прасторы мае не толькі анталагічную, але і аксіялагічную функцыю, паколькі адлюстроўвае ўяўленні аўтара і герояў пра пэўны час, утрымлівае яго ацэнку. На працягу разгортвання дзеяння ўзмацняецца трагічны пафас твора, павялічваецца колькасць трагічных падзей.

Трывожныя ноткі пачынаюць гучаць у «Кузьмовых нататках» з 1930 года: «А што гэта пра цябе ў газетах пісалі? Людзі казалі: «Во ўжо і Батура папаўся» [4, с. 273], у запісах ад 1931 года чытаем: «Карпа быў раскулачаны і высланы» [4, с. 276]. Пазбаўлены магчымасці дзеяння самыя адданыя беларускай справе прадстаўнікі роду Задумаў: Марынка трагічна загінула, у ссылцы Кузьма і Лаўрык: «І вось што мы маем… Ён – там. Я – тут. Бацькі адны. Жонка без працы» [4, с. 278].

Праз роздумы герояў, іх лісты паўстае трагічная праўда часу. Адарваныя ад сям'і, старых бацькоў і маленькіх дзяцей, пазбаўленыя магчымасці творчай і карыснай працы ў імя радзімы, героі перажываюць моцныя душэўныя пакуты: «Дарагія мамуля і татуля! Не клапаціце пра мяне. Я жыву добра. Мы яшчэ ўбачымся калі-небудзь, пажывём разам. Беражыце вы сябе, сваё здароўе. <…> Не крыўдуйце на мяне, што прынёс вам пад старасць, замест радасці, цэлы мех клопату і смутку» [4, с. 281]. Члены сям'і Батураў у такіх драматычных умовах стараюцца трымацца разам, падтрымліваюць адзін аднаго і матэрыяльна, і эмацыянальна («пасабляць мне нічым не рэба, толькі ласкавым словам. Хоць зрэдку прысылай мне пару слоў» [4, с. 281]), не выракаюцца «ворагаў народа» і іх сем'яў. На братоў Пракопа і Рамана кладзецца клопат за сем'і зняволеных братоў Кузьмы і Лаўрыка, за старых бацькоў: «Вялікая табе падзяка за твой клопат пра маю і Кузьмову сям'ю і пра старых

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ ФРАНЦИСКА СКОРИНЫ

бацькоў» [4, с. 281]. Людзі жывуць у пастаянным страху: Рамана і Пракопа час ад часу таксама арыштоўваюць і выпускаюць. Калгаснікі працуюць за працадні, іх абкладаюць непамернымі падаткамі: «Жаліўся бацька, што сёлета палажылі ім страхоўкі многа» [4, с. 288].

Паказальна, што нават у такіх складаных абставінах клопат герояў усё роўна тычыцца адраджэння Беларусі. Лаўрын звяртаецца да Кузьмы: «Раю і прашу цябе не кідаць зусім літаратурных заняткаў» [4, с. 281]. Мары Лаўрына, які знаходзіцца ў зняволенні – калі-небудзь вярнуцца ў Беларусь і адшукаць там шмат карысных выкапняў: «Мне хочацца так працаваць, каб гэта дало нейкі значны гаспадарчы эфект, а недзе далёка ў мяне хаваецца думка, каб – прыдбаўшы моцную кваліфікацыю – калі-небудзь вярнуцца ў Беларусь і адшукаць на яе прасторах значныя карысныя выкапні, якія б стварылі грунтоўныя падваліны для перабудовы эканомікі Беларусі» [4, с. 291].

М. Гарэцкі выявіў драматызм і трагізм гісторыі, трагізм нацыянальнага быцця праз лёс асобнага чалавека, сям'і. Гэта абумоўлівае глыбіню філасофскага падтэксту яго твораў. Са старонак твора М. Гарэцкага паўстае маштабная карціна пакутаў, калі зняволенымі, вырванымі са сваіх родных мясцін аказаліся сотні тысяч ні ў чым не вінаватых людзей, такіх, як простая сялянка Вусцінка, чулая, добразычлівая, і яе маленькія дзеці. М. Гарэцкі перадае боль, перажыванні герояў за лёс блізкіх, немагчымасць нешта змяніць, спыніць вал няшчасцяў, несправядлівасці: «А ішоў дзень за днём, і Рамана і самога няма і няма… Заждаўся Кузьма, растрывожыўся. <…> на вакзале наслухаўся гутарак. “Ідуць пехатою тысячы вёрст…» “Прыйшла бабулька ўзімку ды пад акно: пусціце дзеткі”. Усё думаў пра тую бабку, што нежывую ў Дубраўках знайшлі. Пад капою сена знайшлі. Уроілася яму, што гэта Вусцінка… Знайшлі, не пазналі, пахавалі…» [4, с. 284], «упёрлі Вусцінку ў балота, упёрлі! <…> За што яна гаруе?» [4, с. 294]. Вусцінка «не выцерпела смутку па радзіме і так парывалася ўцячы адтуль» [4, с. 295]. У дарозе яна памерла. Адзін з самых значных беларускіх пісьменнікаў галадае: «Студзень, люты, сакавік – складаў Кузьма каштарыс і перапісваў “Віл. кам.”. Не было дроў. Доўгая зацяжка з зарплатаю. Недаяданне. І ў красавіку – няма дроў, няма грошы, хочацца есці» [4, с. 291]. Старых бацькоў выкідаюць з калгаса, што магло прывесці і да раскулачвання і ссылкі: «Потым атрымаў ліст ад бацькоў. 24 красавіка вычысцілі з калгасу… Прыкра. Крыўда. Пісаў заяву і не паслаў. Куды і каму жаліцца?» [4, с. 292]. Сыны не могуць дапамагчы старым бацькам, маці паміраe ад знясілення: «Вось і загубіла нашу маму гэтая хатняя гаспадарка, як вынік адзіноты, бездапаможнасці, бездагляднасці…» [3, с. 302]. М. Гарэцкі фактычна паказаў трагізм знікнення сялянскай цывілізацыі, з яе ўсталяванымі законамі, этычнымі нормамі.

Такім чынам, у асобе М. Гарэцкага беларуская літаратура прапанавала ўласны погляд на час, гісторыю, прапанавала ўласную канцэпцыю часу, што сведчыла пра сталенне нацыянальнай мастацкай традыцыі.

**Літаратура**


1. Мушынскі, М. Максім Гарэцкі / М. Мушынскі // Гісторыя беларускай літаратуры 20 стагоддзя: у 4 т. – Т. 1: 1901–1920 / Нац. акад. навук Беларусі. – Мінск : Беларуская навука, 1999.– С. 381–427.
2. Адамовіч, А. «Браму скарбаў сваіх адчыняю…» / А. Адамовіч. – Мінск : Выд-ва БДУ, 1980. – 224 с.
3. Адамовіч, А. Камароўская хроніка – творчая гісторыя, жанр / А. Адамовіч // Гарэцкі, М. Збор твораў: у 4 т. – Т. 4. – Камароўская хроніка : Аповесць; Летапіс жыцця і творчасці. – Мінск : Маст. літ., 1986. – 384 с.
4. Уткевіч, В. Праблема суб'екта гістарычнага працэсу ў творах М. Гарэцкага / В. Уткевіч // Максім і Гаўрыла Гарэцкія: жыццё і творчасць. Матэрыялы XVIII Гарэцкіх чытанняў (прысвячаюцца 110-годдзю з дня нараджэння Гаўрылы Гарэцкага). Мінск, 11 чэрвеня 2010 г. Калектыў аўтараў. – Мінск : 2010. – С. 163 – 165.
4. Конан, Ул. Эстэтыка ранняй прозы Максіма Гарэцкага / Ул. Конан // Максім і Гаўрыла Гарэцкія: жыццё і творчасць. Матэрыялы XVIII Гарэцкіх чытанняў (прысвячаюцца 110-годдзю з дня нараджэння Гаўрылы Гарэцкага). Мінск, 11 чэрвеня 2010 г. – Мінск: 2010. – С. 100–107.


Гомельский государственный
университет им. Ф. Скорины

Поступила в редакцию 26.12.2013.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ